Першымі сярод беларусаў на старты выйдуць весляры-акадэмікі — Яўген Залаты і Таццяна Клімовіч. Папярэднія заезды пачнуцца 27 ліпеня. У суботу сваё алімпійскае выступленне пачне плывец Ілья Шымановіч. На старт веласіпеднай гонкі з раздзельным стартам выйдзе Ганна Церах. У нядзелю 28 ліпеня барацьбу пачнуць прымы беларускага плавання Настасся Шкурдай і Аліна Змушко. Самыя трапныя дзяўчаты беларускай каманды Дар'я Чупрыс і Аляксандра Пятрова пачнуць спаборніцтвы па кулявой стральбе 1 жніўня. На наступны дзень, 2 жніўня, у барацьбу за медалі ўступяць скакуны на батуце Іван Літвіновіч і Віялета Бардзілоўская. Моцным абяцае быць 7 жніўня — у гэты дзень пачынаюцца спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе, дзе нашу краіну будзе прадстаўляць Абубакар Хаслаханаў і па таэквандо з удзелам беларуса Георгія Гурцыева. Першы заезд у байдарачніка Уладзіслава Краўца і канаісткі Юліі Трушкінай запланаваны на 8 жніўня. А 9 жніўня на дыван выйдзе барэц вольнага стылю Магамедхабіб Кадзімагамедаў. У гэты ж дзень свае здольнасці прадэманструюць цяжкаатлеты Яўген Ціханцоў і Сюзана Валадзько.

Традыцыйна, напярэдадні Алімпійскіх гульняў, спецыялісты прагназавалі, колькі медалёў, у якіх відах спорту могуць заваяваць беларускія спартсмены. Рабіць прагнозы і так справа няўдзячная, а ў сёлетніх умовах — тым больш. Усе 17 беларускіх спартсменаў ужо паказалі свой чэмпіёнскі характар, прадэманстравалі сілу духа і стойкасць характару, адпаведныя сапраўдным героям спорту. І яны заслугоўваюць шчырай падтрымкі і безумоўнай веры ў іх сілы.

Аляксандр КАРЭЛІН:

«Спартсменам, якія заваявалі пуцёўку на Алімпіяду, трэба не проста выступаць, а ўпрыгожваць п'едэстал»

Цяжкія часы нараджаюць моцных людзей. І калі гэта так, то можна толькі ўявіць, якімі моцнымі будуць нашы спартсмены, калі сусветны спорт перастане хварэць на адхіленні і палітычныя інтрыгі і вернецца ў нармальнае рэчышча. А пакуль застаецца станавіцца мацнейшымі. Найлепшы дапаможнік у пераадоленні цяжкасцяў — прыклады людзей, якія гэта ўжо праходзілі. У спорце такіх людзей больш чым дастаткова. Адзін з іх — Аляксандр Карэлін — трохразовы алімпійскі чэмпіён па грэка-рымскай барацьбе, дзевяціразовы чэмпіён свету, 12-разовы чэмпіён Еўропы, які за ўсю кар'еру выйграў 888 паядынкаў і пацярпеў усяго два паражэнні. І паколькі Аляксандр Карэлін — выхаванец савецкай школы барацьбы, значнае месца ў якой займала і беларуская школа, яго многае звязвае з нашай краінай. Што менавіта ён і расказаў падчас сустрэчы са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і маладымі спартсменамі. Яго карысныя парады, дарэчы, будуць актуальныя кожнаму, незалежна ад роду дзейнасці. Сабралі самае важнае з выступлення спартыўнай легенды, які, як ніхто іншы, засвоіў навуку перамагаць.

ФЕНОМЕН БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

«Феномен беларускай школы барацьбы я бачу ў тым, што ў вашай краіне барацьба — не сталічны спорт. Яна прадстаўлена ва ўсіх рэгіёнах краіны, і не толькі ў абласных гарадах. Дзякуючы гэтаму магчыма шырокая селекцыя, якая немагчыма без моцнай трэнерскай школы. У Беларусі выдатная трэнерская школа. І вы захавалі найлепшыя традыцыі барацьбы. А пераемнасць пакаленняў забяспечвае з'яўленне новых спартсменаў», — адзначае Аляксандр Карэлін.

Чэмпіён расказаў і пра тое, што асабіста яму дорага ў беларускай барацьбе: «Усю маю кар'еру перада мной вялізны, як манумент, стаяў прыклад Аляксандра Васілевіча Мядзвядзя, дай бог яму здароўя. Ён стаў першым, хто даказаў, што адзін чалавек можа стаць трохразовым алімпійскім чэмпіёнам, няхай і ў дзвюх вагавых катэгорыях. І калі ў мяне варухнуўся чарвячок разбуральных сумневаў у сваіх сілах, і я з гарачкі падзяліўся з Віктарам Міхайлавічам Кузняцовым (трэнер Аляксандра Карэліна. «**Зв.**»), ён мне сказаў: «Саша, ты выйграў адзін раз чэмпіянат Еўропы і свету і хочаш усё кінуць. Што табе Аляксандр Васілевіч Мядзведзь сказаў бы?». Мне стала сорамна, я выклаў мокрую форму, узяў сухую і пайшоў на трэніроўку. І гэта прывяло да таго, што ў 1988 годзе я, 20-гадовы хлопец з Навасібірска, аказаўся на Алімпійскіх гульнях у Сеуле. Я, малады, неабстраляны юнак, апынуўся ў камандзе разам з дарослымі, масцітымі барцамі. І не проста трапіў туды. Мне выпала вялікая, траўміравальная сваім цяжарам магчымасць быць сцяганосцам зборнай СССР. Калі я ўявіў, што за мной пойдуць вялікія каманды па баскетболе, валейболе, унікальная каманда па лёгкай атлетыцы, людзі, аб якіх я кнігі чытаў, мне стала дурна. І беларускі барэц Камандар Маджыдаў, які выйграў тыя Гульні, пайшоў са мной на рэпетыцыю цырымоніі адкрыцця. Ён зрабіў ашаламляльнае ўражанне на карэйскіх арганізатараў. Ад хваляванняў мяне адцягвала адна забаўка: я гляджу, як яны спрабуюць дакрануцца да гэтага магутнага атлета з Беларусі. Тады ён дапамог мне не быць раздушаным уражаннямі, паехаў са мной, занядбаў трэніроўкай. Таму для мяне наша ўзаемаразуменне, братэрства і саюзніцтва — частка агульнай вялікай пераможнай гісторыі».

Фота БДУФК

НЕ СПЫНЯЦЬ ТРЭНІРАВАЦЦА

Аляксандр Карэлін ніколі не мяняў каманду, але на трох Алімпійскіх гульнях нёс тры розных сцягі. У 1988 годзе — сцяг СССР. У 1992 годзе — белае палотнішча Міжнароднага алімпійскага камітэта, паколькі спартсмены былога СССР выступалі аб'яднанай камандай. У 1996 годзе Аляксандр Карэлін нёс расійскі трыкалор. Палітычная сітуацыя змянялася, але спартсмены нязменна дэманстравалі свае здольнасці на Алімпійскіх гульнях. У 2024 годзе аб гэтым, вядома, можна толькі марыць. Але, як адзначае Аляксандр Карэлін, шукаць у гэтым вялікую драматургію не варта. Ён называе сённяшнюю сітуацыю напружаным станам нашай гісторыі. Як прыклад — 1984 год, калі ў адказ на непрыезд на Алімпіяду-80 у Маскву спартсменаў капіталістычных краін краіны соцлагера не паехалі на Гульні ў Лос-Анджэлес. Але была знойдзена альтэрнатыва — Гульні «Дружба-1984».

«Вельмі важна, каб спартсмены не спынялі трэніравацца. Ёсць адна вельмі важная акалічнасць — спартыўны век вельмі хуткі. Але гэта не адмяняе нашых задач рыхтаваць новае спартыўнае пакаленне, каб калі алімпійскі рух вернецца да розуму і адэкватнасці, мы былі канкурэнтаздольнымі і мацнейшымі. А тым спартсменам, якім удалося заваяваць жаданую пуцёўку, нягледзячы на дыскрымінацыю і жудасную кан'юнктуру, трэба абавязкова ехаць на Алімпійскія гульні. І не проста выступаць, а ўпрыгожваць сабой п'едэстал», — перакананы Аляксандр Карэлін.

ГАЛОЎНАЯ МЭТА

Спартыўны крызіс, нядопуск мацнейшых спартсменаў на міжнародныя спаборніцтвы, поўная нявызначанасць ставяць спартсменаў і ўсіх нераўнадушных да спорту перад пытаннем «дзе шукаць матывацыю?». Сапраўды, дзеля чаго працаваць, калі ўсю тваю працу можна перакрэсліць часта нічым не растлумачанае рашэнне спартыўных чыноўнікаў. У Аляксандра Карэліна ёсць канкрэтны адказ на пытанне, што рабіць у гэтай сітуацыі: «Трэніруйцеся, трэніруйцеся і яшчэ раз трэніруйцеся. А не шукайце апраўданняў. Усё, што ты праходзіш на спартыўным шляху, застаецца з табой: перажытыя нагрузкі, атрыманыя перамогі, выкараненыя сумненні, удзячнасць трэнера, пахвала настаўніка. Дзеля гэтага варта займацца, дзеля гэтага варта быць моцным. І гэта галоўнае. Да, можа не атрымацца выйграць тры разы Алімпійскія гульні, але ногі-«тапталкі» і рукі-«хапалкі» застануцца з табой назаўсёды. Лепей быць моцным і без матывацыі, чым заматываванай размазнёй».

Мандраж, траўмы, жыццёвыя складанасці, палітычныя інтрыгі — усё гэта, на думку Аляксандра Карэліна, варта перацярпець і пераадолець дзеля галоўнай мэты: «Якая галоўная мэта спорту вышэйшых дасягненняў. На маю думку, даказаць бязмежнасць чалавечых магчымасцяў. І тут мы маем цудоўны набор красамоўных прыкладаў. У кожным відзе спорту адналькавыя для ўсіх правілы. Але мы ведаем унікальны прыклад Мядзведзя. Я першы раз убачыў Аляксандра Васільевіча ў самалёце, мне тады падалося, што я лячу ад шчасця хуткасці за гэты самалёт. А ён мне: «Сашок, не садзіся на гаршок». Я быў шчаслівы толькі ад таго, што ён ведае, як мяне завуць. І дзеля таго, каб быць часткай такой гісторыі, каб тваё імя ведалі людзі, аб якіх ты чытаў кнігі, варта перацярпець усё, што заўгодна: і хваляванні, і мандраж, і траўмы».

Алім СЕЛІМАЎ:

«Гэта сапраўдны ўдар. Але мы яго вытрымаем»

Сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з Аляксандрам Карэліным падзяліўся і старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы Алім Селімаў: «Вельмі карысная для нашай моладзі сустрэча. Калі ў спартсмена ёсць магчымасць напрамую задаць пытанне легендзе спорту, які прайшоў вельмі складаны шлях, і атрымаць разгорнуты адказ — гэта дарагога варта. Я перакананы, што, акрамя карысці, гэтыя сустрэча прынесла яшчэ і матывацыю».

А матывацыя беларускім барцам цяпер неабходна як ніколі, не перашкодзіць і сіла духу. Міжнародны алімпійскі камітэт не дапусціў на Гульні ў Парыж наймацнейшых беларускіх спартсменаў: Ванэсу Каладзінскую, Ірыну Курачкіну, Паўла Глінчука і іншых спартсменаў, якія ў чэснай і ўпартай барацьбе заваявалі алімпійскія ліцэнзіі. У людзей забралі мару і мэту ў самым прамым сэнсе. «Вядома, настрой у камандзе падаўлены, папраўдзе сказаць. Як у саміх спартсменаў, так і ў нас, кіраўнікоў. Мы ўсе жылі адной марай, на працягу чатырох гадоў рабілі ўсё, каб развіваць барацьбу і дасягаць максімальнага выніку. Спартсмены трэніраваліся, не шкадуючы сябе, мы ўкладвалі безліч сродкаў, сіл, энергіі. І ў выніку атрымалі такі несправядлівы, неабгрунтаваны адказ. Гэта сапраўдны ўдар, — дзеліцца Алім Селімаў. — Мы разумеем, што Міжнародны алімпійскі камітэт страціў усялякую самастойнасць. Ён мог бы быць арганізацыяй, якая праз спорт аб'ядноўвае людзей, мог бы зрабіць спорт мяккай сілай для вырашэння палітычных пытанняў. Але гэтага не здарылася, і гэта балюча. Але жыццё працягваецца, трэба станавіцца мацнейшымі, трымаць удар, ставіць новыя мэты. Будзем спадзявацца, што ўся гэтая несправядлівасць хуткім часам скончыцца і Міжнародны алімпійскі камітэт стане органам, які аб'ядноўвае, а не раз'ядноўвае».

За сябе і за таго хлопца, ды і за дзяўчат на Алімпійскіх гульнях у Парыжы будуць выступаць два спартсмены — малады і перспектыўны барэц грэка-рымскага стылю Абубакар Хаслаханаў і дасведчаны і вопытны вольнік Магамедхабіб Кадзімагамедаў. Прычым Абубакар быў дапушчаны адразу. А Магамедхабіб абсалютна нечакана атрымаў запрашэнне ад МАК.

Рана ці позна крызіс міне, і нашы спартсмены змогуць выступаць на спаборніцтвах таму, што яны на гэта здольныя, а не таму, што нехта ім дазволіць ці не. І тут за барацьбу хвалявацца, вядома, можна, але баяцца не трэба. Змена расце моцная. На нядаўнім першынстве Еўропы U-20 беларусы заваявалі шэсць медалёў, а на чэмпіянаце Еўропы да 18 гадоў — пяць узнагарод. Алім Селімаў у гэтым бачыць не цуд, а вынік правільна арганізаванай працы: «Калі два гады таму нас адхілілі ад міжнародных стартаў, Беларускай федэрацыяй барацьбы было прынята рашэнне зрабіць акцэнт на моладзі, каб яна не згубілася, каб у маладых спартсменаў не зніклі жаданне і матывацыя займацца барацьбой. Адзін з самых паспяховых праектаў «Ліга храбрых» ужо даў свае плады. Усе прызёры нядаўніх юніёрскіх і юнацкіх чэмпіянатаў Еўропы прайшлі праз гэты праект. «Ліга храбрых» без перабольшання надала штуршок развіццю барацьбы. Мы назіраем, што колькасць дзяцей у секцыях павялічылася. Хоць і кажуць, што барацьба непапулярны від спорту і цяжкі для разумення, але магу з упэўненасцю сказаць, што ў нашай краіне барацьбой цікавяцца і яе глядзяць. І самае галоўнае, што барацьба заўсёды прыносіла краіне нямала медалёў. Таму працуем далей і з дарослымі, і з дзецьмі, праводзім цікавыя праекты, як бы ні было цяжка. Прынцып піраміды — чым больш у нас дзяцей у рэзерве, тым лепшы вынік у спорце вышэйшых дасягненняў — яшчэ ніколі нас не падводзіў».

Іван ЦІХАН:

«Нашы лёгкаатлеты прывыклі працаваць на максімум, што б ні адбывалася»

Пачынаючы з 1956-га года беларускія лёгкаатлеты не вярталіся з Алімпійскіх гульняў без медалёў. На адной Алімпіядзе іх магло быць менш, на другой — больш. Але нязменна Беларусь мела медаль з алімпійскіх лёгкаатлетычных спаборніцтваў. На жаль, нават у такім цудоўным правіле ёсць выключэнне. Сёлета беларускія лёгкаатлеты з алімпійскага Парыжу медалёў не прывязуць, бо не паедуць туды. Міжнародная асацыяцыя лёгкаатлетычных федэрацый наадрэз адмовілася пускаць беларусаў на міжнародныя старты. Нягледзячы на вялікую крыўду, апусціць рукі — самы просты варыянт, да якога нашы спартсмены ніколі не звярталіся. Таму, нягледзячы на ўсе складанасці, айчынная каралева спорту жыве, плённа (наколькі гэта магчыма ў такіх умовах) развіваецца і здавацца не плануе. Як з цяжкасцямі спраўляецца лёгкаатлетычная сям'я «Звяздзе» расказаў старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Іван Ціхан.

Фота БФЛА

— Іван Рыгоравіч, упершыню за 40 гадоў беларускія лёгкаатлеты не выступяць на Алімпійскіх гульнях. Як настрой у камандзе ў сувязі з такімі навінамі?

— Я ўвесь час стрымліваўся і ва ўсіх інтэрв'ю казаў, што мы спадзяемся і верым у тое, што прынцыпы алімпізму перамогуць і гэтак далей. Але ў глыбіні душы разумеў, што ехаць у Парыж на такіх умовах не мае сэнсу. Алімпійскія гульні — гэта вяршыня спорту. Там дробязяў не бывае. Каб дасягнуць высокіх вынікаў, праца павінна быць выбудавана так, каб спартсмена анішто не адцягвала ад выступлення. Адпраўляць спартсмена без урача, без прадстаўніка федэрацыі, пад пастаянны псіхалагічны ціск — загадзя пройгрышны варыянт. Нават, калі ў спартсмена наймацнейшая матывацыя, паказаць вынік у такіх умовах крайне цяжка. Мы цудоўна разумелі, што Міжнародная асацыяцыя лёгкаатлетычных федэрацый свайго рашэння не зменіць. Прэзідэнт IIAF Себасцьян Коу выказаўся жорстка і канкрэтна, што беларускіх і расійскіх спартсменаў на міжнародных спаборніцтвах не будзе. Але мы не маглі забраць у нашых спартсменаў мару і надзею выступіць на Алімпійскіх гульнях, таму да апошняга пісалі лісты, да апошняга спрабавалі дамовіцца, пераканаць міжнародных чыноўнікаў, абаранялі сваіх спартсменаў, хоць у глыбіні душы разумелі, што нас не пачуюць. Самае непрыемнае, што Себасцьян Коу ў 1980 годзе сам быў у падобнай сітуацыі (на Алімпійскіх гульнях у Маскве з-за байкоту гульняў Вялікабрытаніяй выступаў пад сцягам Алімпійскага руху. — **Заўв.**). Крыўдна, што праз 40 гадоў яго асабістыя амбіцыі і погляды сталі вышэй, чым лёгкая атлетыка і сумленны спорт.

Настрой у спартсменаў у цэлым нармальны, яны працуюць, спаборнічаюць. Ужо прайшоў адзін з галоўных стартаў летняга сезону — чэмпіянат Беларусі, зараз лёгкаатлеты рыхтуюцца да Кубка краіны. У іх ёсць і матэрыяльная матывацыя. Вынікі, паказаныя на Кубку Беларусі, прыраўніваюцца да вынікаў чэмпіянату Еўропы. Гэты турнір ужо прайшоў і ў нашых лідараў ёсць магчымасць прадэманстраваць дома вынікі, адпаведныя чэмпіянату Еўропы.

— А форму спартсмены за два гады адхілення не згубілі?

— Зусім не. Возьмем да прыкладу спартыўныя Гульні БРІКС, буйны міжнародны старт, які для нас стаў асноўным у гэтым сезоне. Каманда выступіла дастойна, заваявала 30 медалёў. У нашых спартсменаў шмат асабістых рэкордаў. Максім Андралойць зрабіў сабе на дзень нараджэння падарунак — сярэбраны медаль і асабісты рэкорд у шматбор'і — 8279 балаў. Лізавета Валуева ў сектары для скачкоў у вышыню заняла другое месца і ўсталявала юніёрскі рэкорд краіны — 1 м 95 см. Змагалася на роўных з Карынай Дзямідзік, якая паказала вынік у 1 м 91 см. Яшчэ ў сваю спартыўную бытнасць на чэмпіянаце Еўропы 2016 года жыў у адным нумары з Паўлам Селівярставым, тады адзначыў яго сур'ёзны падыход да справы. У Паўла пасля гэтага быў невялікі спад, але ў цэлым ён не падвёў. У Казані скокнуў у вышыню 2 м 30 см — заняў другое месца. А побач з ім — на трэцім месцы з вынікам 2 м 27 см Мікіта Данілаў. У трайным скачку Віялета Скварцова перамагла з вынікам 14.41, але, на жаль, атрымала траўму і ў сектар для скачкоў у даўжыню не выйшла. Затое Уладзіслаў Булахоў наскакаў на 7.70 метраў, хлопец — таланцішча, і фактурны, і адукаваны. На жаль, пакуль не можа свой патэнцыял поўнасцю раскрыць. Спадзяюся, ўсё ў яго атрымаецца. У жаночым кіданні молата нашы Анастасія Маслава і Алена Собалева занялі першае і другое месца адпаведна, нанеслі адказны ўдар расіянкам Лізавеце Царовай і Анастасіі Грыгор'евай, якія на мінулым чэмпіянаце Беларусі іх абышлі. У штурханні ядра Алена Дубіцкая нязменна стабільна выступае, у Казані таксама перамагла, прынамсі як і Алег Тамашэвіч. Малады спартсмен Яўген Брыгі не справіўся з эмоцыямі і не зафіксаваў ніводнай спробы, што для штурхання ядра, канешне, рэдкасць. Але гэта не паказчык, бо на чэмпіянаце краіны ён перамог. У кіданні кап'я Таццяна Халадовіч лідарства нікому не аддае, Аляксей Каткавец бароўся да апошняга, але ўсё ж такі заняў другое месца. У забегу на 1500 метраў нашых Вячаслава Скуднага і Дзмітрыя Савіна як канкурэнтаў не разглядалі. А яны ўсіх перамаглі. Спартыўная хадзьба ў Расіі знаходзіцца на найвышэйшым узроўні. А наша Ганна Церлюкевіч заняла трэцяе месца. Гэта сапраўды подзвіг — канкурэнцыя каласальная, судзейства жорсткае, да таго ж яны хадзілі па стадыёне, а 10 кіламетраў па стадыёне прайсці не так проста. Мы вельмі ганарымся Ганнай. У цэлым каманда паказала класнае выступленне. Мы ўбачылі, у якой форме нашы лідары, праверылі здольнасці маладога пакалення. Вельмі радуе, што моладзь у многіх відах сёння можа канкураваць з больш дасведчанымі спартсменамі. Калі ты ведаеш, што адзіны і непаўторны, гэта крыху расслабляе, а калі ёсць і яшчэ партсмены за табой — гэта выдатна матывуе падключаць усе свае рэзервы.

— Ці трэба спартсменам у сённяшніх умовах выкладвацца на максімум?

— Безумоўна. Тым больш узровень лёгкай атлетыкі ўвесь час расце, і для таго, каб паказваць высокі вынік, трэба вельмі і вельмі шмат працаваць. Калі ад спартсмена патрабуюць сярэдніх вынікаў — ён не атрымлівае задавальнення ад працы. Нашы лёгкаатлеты прывыклі працаваць на максімум, што б ні адбывалася, і немагчыма ўсё жыццё максімальна працаваць, а потым перахадзіць на сярэдні ўзровень. Гэта як сабе здрадзіць. Не варта забываць, што расійскія спартсмены, з якімі мы зараз спаборнічаем, — вельмі моцныя сапернікі. Магчыма, у некаторых дысцыплінах вынікі крыху ўпалі, але расіяне застаюцца вельмі моцнымі, і канкураваць з імі цікава.

— Іван Рыгоравіч, у вас як у кіраўніка няма апасенняў, што, калі ў найбліжэйшы час крызіс не скончыцца, вядучым спартсменам гэта можа надакучыць, можа лопнуць цярпенне, знікне матывацыя, і мы просто згубім класных лёгкаатлетаў?

— Па-рознаму можа быць. Але я ўсё ж спадзяюся, што ў нашых спартсменаў характар чэмпіёнскі. Ім гэта не можа надакучыць. Таму што спорт — гэта іх пакліканне, гэта тое, чым яны жывуць кожны дзень. Я сем гадоў не выступаў, і вяртацца было вельмі складана, але магчыма. Таму я перакананы, што нашы спартсмены справяцца з усімі цяжкасцямі. Як мінімум у іх ніхто не забіраў магчымасць устанавіць сусветныя рэкорды. Нашы спаборніцтвы ўключаны ў міжнародны каляндар, і рэкорды нашых спартсменаў фіксуюцца. Вядома, усталяваць сусветны рэкорд проста толькі на словах, на справе ж архіскладана. Але гэта нядрэнная матывацыя не апускаць рукі. Я не думаю, што нашым лёгкаатлетам надакучыць выступаць. Спартсменам рухае жаданне рэалізоўвацца на спаборніцтвах, а стартаў у нас хапае. Сёння можна спакойна выступаць на спаборніцтвах у Расійскай Федэрацыі і расці ў сваіх вынніках. І гэта бачым на прыкладзе нашай моладзі, якая абнаўляе нацыянальныя рэкорды. Лідары ёсць, вынікі ёсць. А лёгкая атлетыка была, ёсць і будзе цешыць сваіх прыхільнікаў. Як каралева спорту можа інакш?

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

НАЗАПАСІМ ВІТАМІНЫ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Ёсць у Валяр'янава невялікі пакуль адкрыты рынак (ён пашыраецца) і дастаткова вялікі павільён. Сказаць адназначна, дзе сезонная прадукцыя таннейшая, немагчыма: па кожнай пазіцыі сітуацыя свая.

Для пачатку накіроўваемся да памідораў-агуркоў. Кошт на першыя — аж да 15 рублёў (за асобныя эксклюзіўныя сарты) і да 4-5, агуркі можна набыць па кошце ад 3 да 5 рублёў за кіло.

— Цэны змяняюцца кожную гадзіну, — распавядае прадавец Надзея. — Раніцай баклажаны прадавалі па пяць, цяпер ужо па тры. Такая спякота — навошта, каб псаваўся тавар? Дыня была па 8, а цяпер ужо 6.

Па таматах варыянтаў у Валяр'янаве цяпер маса — ад ружовых да чорных, жоўтых, зялёных, рознакаляровых і паласатых, ад «гігантаў» да чэры.

— Памідоры ўсе нашы, гродзенскія, у асноўным з Іўя, — расказвае суразмоўніца пра свой асартымент. — Вышэй шасці рублёў на памідоры цэн у мяне няма. Агуркі па тры з паловай. Салодкі перац — па 10, таксама гродзенскі, а востры перчык — ай! — махае рукой Надзея, — Штучка — капеек 80, а каму з пакупнікоў — і проста ў падарунак. А што вы думалі? У нас ёсць пастаянныя, любімыя пакупнікі.

Нібы ў пацвярджэнне яе слоў, з'яўляецца адна з такіх пакупніц.

— Памятаеце, якую мне мінулы раз бульбу давалі? Ёсць такая сёння?

— Вядома! Пароль — «нясвіжская бульбачка», — смяецца Надзея. — У нас ёсць усё для любімага пакупніка!

— Бульба ў нас нясвіжская і з Баранавіч, — гэта яна кажа ўжо мне. — Мытая — баранавіцкая, у іх ёсць машыны, якія яе мыюць.

Прадае «нацыянальны карняплод» Надзея па 3 рублі за кілаграм. У сярэднім у Валяр'янаве маладая бульба — ад 3 рублёў да 4 з паловай

Надзея — індывідуальны прадпрымальнік, 25 гадоў у гандлі, працуе менавіта з фермерскай прадукцыяй: цэніць якасць.

— Увесь тавар ідэальны, бачыце? Што буякі, што маліна... Нам пакупнікі часам «вочы выядаюць», што на Камароўцы танней. Але ў нас прадукцыя адборная, фермерская. Самая лепшая — з Гродзеншчыны, — дзеліцца асабістымі прыхільнасцямі суразмоўніца. — Мне падабаецца тое, што вырошчваюць у Іўі. Віцебская вобласць таксама выдатна гародніну і ягады расціць, асабліва Бягомль. Там практычна не выкарыстоўваюць ніякай «хіміі», усё вельмі экалагічна. Таму і аб'ёмы невялікія. Калі Гродзенская вобласць прывозіць, дапусцім, агурочкі, то гэта кілаграмаў 100. А пінскія і альшанскія агуркі едуць фурамі. Я гродненскую прадукцыю заўсёды імкнуся браць.

Ну, а калі не спадзявацца на чужое меркаванне, нават самае аўтарытэтнае, у Валяр'янаве прадстаўлена шырокая геаграфія, можна пакаштаваць ураджай практычна з усіх рэгіёнаў краіны.

— Мы — пінская фермерская гаспадарка, усё вырошчваем самі, — распавядае Наталля, якая гандлюе ў суседняй палатцы адкрытага рынку. — Спецыялізуемся на памідорах. Ужо гадоў 20 імі займаемся. У нас на продаж — больш за 50 сартоў таматаў.

Самыя дарагія таматы ў Наталлі — па 15, але сярэдняя цана — 5–6 рублёў за кіло. А па вонкавым выглядзе тут такая разнастайнасць формаў і фарбаў, што да яе можна прыходзіць як у «музей памідораў»: некаторыя сарты вы, упэўнена, ніколі не бачылі. Напрыклад, часночны памідор (5 рублёў кіло).

— Насенне ў нас з усяго свету. Ёсць і індыйскае, і з Амерыкі.

— Індыйскія сарты ў нас растуць?

— Вядома. І памідоры, і іншыя культуры. Прывозілі мы, напрыклад, на продаж індыйскі белы агурок, які вырасцілі. Ён сапраўды белага колеру. Пакупнікам спадабаўся. Каб усё расло, патрэбны добрыя рукі. І веды, зразумела. І жаданне працаваць. Калі захочаш — вырасціш што заўгодна. Галоўнае — захацець. Гэта наша жыццё, — паказвае на скрыні з рознакаляровымі памідорамі суразмоўніца. — Мы гэтым жывём. А ўвогуле, на зямлі працаваць, зразумела, няпроста. У нас кажуць: на зямлі яшчэ ніхто не разбагацеў.

Наталля тлумачыць, што раней шмат гадоў сваёй прадукцыяй гандлявала на Камароўцы, а цяпер, вось ужо 4 гады — тут, у Валяр'янаве. І пастаянныя пакупнікі «перавандравалі» сюды за ёй.

— Усё расцім у цяпліцах. На грунце — гэта калі ў каго вялікія гектары. У нас не такія аб'ёмы. Працуем круглы год, цяпліцы ў нас ацяпляльныя. Пра нас, пінчукоў, кажуць: маўляў, вы ўсё мераеце кватэрамі. Мусіць, так і ёсць. Дык вось, мой муж кажа: у нас ужо не адна кватэра ў цяпліцы ўкладзена. І гэта праўда: укладанняў патрабуецца шмат.

Асабіста ёй, расказвае Наталля, больш за ўсё падабаюцца сарты памідораў, якія ў саспелым выглядзе застаюцца зялёнай афарбоўкі.

— Яны такія і павінны быць, — тлумачыць яна, пяшчотна ўзяўшы ў рукі «памідорны эксклюзіў» з вітрыны. — Гэты ўжо саспелы, навобмацак крышачку мяккі. У яго смак з фруктовымі ноткамі.

Тут жа можна набыць соусы і аджыкі, а таксама натуральны таматны сок — без солі і цукру, з розных сартоў памідораў (на кожным слоіку пазначана, з якіх): 20 рублёў за паўлітра.

Наогул, калі вы з тых, хто «любіць вачыма», вам — на фермерскі рынак: тут усё прыгожа, усё хочацца з'есці, а перад гэтым — сфатаграфаваць. Або напісаць алейнымі фарбамі на палатне.

Маладую белакачанную капусту ў Валяр'янаве прадаюць па 3 рублі за кіло. Каляровая капуста (Смалявіцкі раён) — 10 рублёў за кіло. Морква ўраджаю гэтага лета — па 3,5–5 рублёў за кілаграм. Каб морква вырасла салодкай, ёй трэба шмат сонца, расказвае прадавец. Гэтым летам сонца ў Беларусі дастаткова, зямля прагрэлася, так што морква смачная. Як і малады бурак (па тым жа кошце). Кабачкі прапануюць за тыя ж 3 рублі.

Маладая цыбуля — думаю, знойдуцца тыя, хто са мной у гэтым пагодзіцца — зусім асобная гародніна, якая мае няшмат агульнага з цыбуляй «зімовай», якую мы купляем у ліставідзе–сакавіку. Маладая — павінна быць салодкай і сакавітай, цвёрдай і хрумсткай. У Валяр'янаве зараз — менавіта такая, так што купляць гэтую пазіцыю аматарам варта тут. Просяць за кілаграм цыбулі сёлетняга ўраджаю таксама 3 рублі.

Сучасны чалавек спажывае катастрафічна мала ліставой зеляніны, а гэта ж фітанцыды, якія ўмацоўваюць імунітэт, і цынк, які адказвае за здароўе касцей і цягліц, паўтараюць дыетолагі. Што ж, даведаемся пра кошты на зеляніну. Трэба сказаць, што ліставая зеляніна дарагая дзе б там ні было. Усе гэтыя цыбулька-кропчык, пятрушка-базілік, шпінат-кінза, траўка ды лісцікі па факце выходзяць даражэйшымі за мяса. У Валяр'янаве вам давядзецца выкласці 5 рублёў за 100 г кінзы, рукалы і базіліка, 10 — за такі ж аб'ём размарыну (хоць можна знайсці і танней). Салаты ў асартыменце — 2,50 за 100 г. Лук парэй са Смалявіч прадаюць аж па 35 рублёў за кіло. Звыклыя зялёную цыбулю, кроп і пятрушку — па 2 рублі за 100 г.

А што наконт ягад?

— Маліны нятанныя, — прызнае прадавец. — Але вельмі якасныя, буйныя і салодкія. 20 рублёў за кілаграм.

Шаўкоўніцы (іх лёгка зблытаць з ажынамі) — у тую ж цану.

— Шаўкоўніцы і ажыны падобныя, але ажыны на кусце растуць, а шаўкоўніцы — на дрэве, — растлумачылі мне.

Ёсць нават апошнія ўжо клубніцы — каштуюць, праўда, аж 30 рублёў за кілаграм (можна знайсці і па 25). Прадаўцы гавораць, сезон гэтых ягад скончаны, адсюль і кошт. З разраду «папесціць сябе» і лісічкі — 25 рублёў кілаграм. Беларускі брэнд апошніх гадоў, буякі, дэманструюць досыць шырокі роскід коштаў — ад 13 да 20 рублёў за кіло.

Ужо наступіў сезон кавуноў, і ў Валяр'янаве яны, зразумела, ёсць, але не беларускія, а з Казахстана і расійскія (Краснадар). Каштуюць 3-4,5 рубля за кілаграм.

— Беларускія кавуны пазней з'явяцца, — кажа прадавец.

Ёсць ужо першыя айчынныя грушы і яблыкі новага ўраджаю: белы наліў і іншыя ранніе сарты. Каштуюць яны ў сярэднім 5 рублёў за кілаграм.

У ПОШУКАХ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Псіхолагі сцвярджаюць, што наша жыццё вызначае выбар, і ўпэўненасць у магчымасці яго зрабіць — неад'емная частка камфортнага светаўспрымання сучаснага чалавека. Рэалізуем гэту магчымасць і адправімся ў адну з самых «народных» сеткавых крам, каб параўнаць «з фермерамі» цэны на сезонную гародніну-садавіну. Зразумела, што «вынаходствы» тут шукаць не варта, ну а што на прадмет эканоміі?

Выбар таматаў ёсць, вырашчаны яны (у асноўным) у буйных гаспадарках, па выглядзе — досыць годныя, розных сартоў і колераў. Варыянтаў ад айчыннага вытворцы — сем (у дастаўцы, асартымент кожнай канкрэтнай крамы сеткі, зразумела, залежыць ад яе памеру). Па коштах — 4,29-4,99 да за кіло. Жоўтыя беларускія памідоры каштуюць 10,59 за кілаграм, чорныя (сорт Наомі, вырашчаныя ў Нясвіжы) — нават 15,99. Беларускія чэры прапануюцца ад 9,65 аж да 22,99 за кілаграм. Ёсць імпартныя таматы — 5,89 (Польшча), 7,25 (Азербайджан), 6,49 (Турцыя). У цэлым можна купіць кілаграм самых звычайных памідорчыкаў на стол за тыя ж 5–6 рублёў. Агуркі гладкія айчыннай вытворчасці — класічны «зімовы» варыянт — на фоне памідораў танныя: 2,95 за кілаграм. Невялікія пупырчатыя — танней: 2,79.

Моркву новага ўраджаю з Расіі — нямытую і даволі бледную — можна набыць па 1,95. Беларускую, прыгожую, яркую і мытую — па 2,59. Айчынную белакачанную капусту ўраджаю бягучага года прапануюць па 1,19, расійскі грунтавы перац — за 5 без адной капейкі рублёў за кіло (іранскі, буйны, прыгожы, сорту «Каліфорнія» — 11,99). Маладая цыбуля з Казахстана — у межах 2 рублёў за кіло, фіялетавая (Узбекістан) — капеек на 50 даражэй, самая звычайная «рэпка» (той жа Узбекістан) — 1,74. Ранняя рэпчатая цыбуля айчыннай вытворчасці (на цэнніку пазначана: «фермерская») — 2,88 за кіло. Баклажаны — 8,69. Бульба ранняя, беларуская, ад 1,83 да 2,76 за кілаграм.

Кавуны ў краме ў асноўным расійскія, 3,89—4,99 за кілаграм у залежнасці ад сорту. Буякі (беларускія) можна набыць па 20 без адной капейкі рублёў за кілаграм, ёсць варыянты на зняволі. А вось свежая маліна (Беларусь) абыдзецца ў 11 без капейкі рублёў за 125 г (або больш за 80 рублёў за кіло, што, вядома, уражвае). Пра што ўсё гэта нам гаворыць? Пра тое, што трэба быць гнуткім і «купляць з розумам», выбіраючы розныя пазіцыі ў розных месцах.

Што датычыцца зеляніны, то па цэнах — у сярэднім ад рубля да двух за 30–50 г. Затое тут ёсць такая таварная пазіцыя, як мікразеляніна: прыхільнікі правільнага харчавання гэта ўжо ацанілі. Прычым мікразеляніна бывае ў асартыменце: гарох, сланечнік, капуста, буракі і г. д. Кошт — каля 3–4 рублёў за 80–100 г. На рынках, нават фермерскіх, мікразеляніва звычайна няма.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,
фота аўтара.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Калі жадаеце пазбегнуць непаразумення ў сям'і і з дзелавымі партнёрамі, сачыце за сваімі выказваннямі і тонам, бо іншы раз нават самы бяскрыўдны жарт бывае небяспечным для жартаўніка. У сераду можаце шмат чаго дасягнуць, паспрабуйце не сядзець ні хвіліны без справы, але і не спяшайцеся — гэтым вы толькі адкладзяце вынік. Дзяліцеся ведамі з тымі, каму гэта неабходна. У другой палове тыдня вас можа закружыць віхура сямейных і бытавых праблем.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні паспрабуйце не толькі слухаць, але і чуць, добра было б прааналізаваць новую інфармацыю. Калі зразумееце, што свет круціцца не толькі вакол вас, то зможаце пазбегнуць шматлікіх непрыемнасцяў. У панядзелак рызыкуеце растраціць занадта шмат сіл і сродкаў на дробязі, не вартыя ўвагі. У чацвер верагодныя нечаканыя, але цікавыя паездкі. У суботу збярыце сваю волю ў кулак і паспрабуйце не раздражняцца і не зрывацца на блізкіх.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні вам, магчыма, прыйдзецца нават хавацца ад патоку прывабных прапаноў, які раптоўна абрынецца на вас. Неабходна папрацаваць, каб не ўшчымліць уласных інтарэсаў і нікога не пакрыўдзіць. Затое перспектывы перад вамі адкрываюцца вельмі прывабныя. Удалы час і для творчасці, і для працы, і для асабістага жыцця. Ды і адпачняце вы з задавальненнем.

РАК. Нядрэнна было б навесці парадак і ў паперах, і ў галаве, і ў асабістых адносінах. Пажадана захоўваць эмацыянальную раўнавагу і верыць у найлепшае. У сярэдзіне тыдня будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі, магчыма далёкае падарожжа, якое дазволіць атрымаць поспех у справах і будзе садзейнічаць умацаванню здароўя. У выхадныя варта выбрацца за горад ці наведаць цікавае мерапрыемства.

ЛЕЎ. Панядзелак і аўторак спрыяюць гарманізацыі асабістых адносін. Вам цяпер вельмі непажадана адхіляцца ад вызначаных мэт, якімі б вялікімі ні былі спакусы. Можа з'явіцца жаданне быць напярэдзе ўсіх, і ў вас для гэтага будзе шмат шанцаў. Пажадана ў некаторых сітуацыях паспрабаваць праявіць такт і цярпенне — калегі і сябры ацэняць гэта па заслугах. Удзяліце блізкім людзям дастаткова ўвагі хоць бы ў выхадныя.

ДЗЕВА. З дапамогай нестандартнага мыслення і кемлівасці вы шмат чаго можаце дасягнуць. Панядзелак прысвяціце завяршэнню старых спраў і выпраўленню памылак. У гэты дзень для вас можа быць цяжарам пільная цікавасць з боку партнёраў і калег. Не выключана, што ў сераду нядобразычліўцы паспрабуюць справакаваць вас на канфлікт. У пятніцу адбудзецца падзея, якая можа адкрыць перад вамі новыя магчымасці ў прафесійным плане. Да суботы паспрабуйце завяршыць бягучыя справы і вярнуцца дадому з камандзіроўкі, калі вы ў такую з'язджалі.

ШАЛІ. На гэтым тыдні на ваш светапогляд можа сур'ёзна паўплываць фінансавы аспект: магчымасць годна зарабляць і прымаць рашэнні аб расходах самастойна. Дадайце ў свой вобраз загадкавасці і рамантыкі. У сераду любыя рызыкоўныя мерапрыемствы катэгарычна забараняюцца. У гэты дзень варта ўсвядоміць, што ўскладзеныя на вас абавязкі — не нагода скідаць назапашанае раздражненне на калег. У пятніцу для адчування паўнаты жыцця пагутарыце з сябрамі на філасофскія тэмы.

СКАРПІЁН. Удача ўсміхнецца вам на прафесійнай ніве, вашы аўтарытэт і даходы будуць расці, павольна, але няспынна. Будзеце прыцягваць навакольных, зачароўваць іх. Жыццё падорыць нямала шанцаў дабіцца сваіх мэт. Прыслухайцеся да сваёй інтуіцыі, праяўце ініцыятыву на працы, і яна будзе ўзнагароджана. Не забывайце пра сямейныя справы і любоўныя спатканні, без якіх ваша існаванне будзе прэсным.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні не варта мітусіцца і бегаць, як вавёрка ў коле і ўсё па крузе. Не варта браць за ўсе справы адначасова — рызыкуеце наступіць на знаёмыя граблі. Лепш за ўсё спакойна заняцца сваімі асабістымі праблемамі. У другой палове тыдня намецяцца пэўныя змены. Магчыма, вам спатрэбіцца дапамога калег або сяброў, не адштурхоўвайце яе, а прыміце з падзякай. У нядзелю не давядзецца сумаваць, блізкія пра вас не забудуць, паспрабуйце не крыўдзіць іх і не адмаўляйцеся ад сустрэчы.

КАЗЯРОГ. Тыдзень выдатна падыходзіць для адпачынку. Хоць некаторыя з вашых планаў могуць разбурыцца, але гэта не нагода для засмучэнняў, яны толькі саступяць месца новым больш рэалістычным мэтам. У аўторак будуць паспяховыя дзелавыя перагаворы, падпісанне дагавораў. Больш часу аддавайце блізкім людзям. Вы можаце натхніць іх на творчы парыў. У чацвер лепш не прымаць сур'ёзных рашэнняў, пастарайцеся стрымліваць свае эмоцыі і захоўваць душэўную раўнавагу. Выхадныя правядзіце на прыродзе.

ВАДАЛІЎ. Пастарайцеся хоць бы на гэтым тыдні разгрузіць сябе ад лішніх і чужых спраў і пустых размоў. У аўторак нечаканыя праблемы могуць затармазіць вас, стаміць і практычна давесці да стрэсу. Не апускайце рукі, і ўсё ў вас атрымаецца, але спатрэбіцца на парадак больш намаганняў. У чацвер варта кінуць сілы на вырашэнне старых праблем, а каб не губляць упэўненасці ў сваіх сілах, больш майце зносін з блізкімі людзьмі. У выхадныя імкніцеся ва ўсім захоўваць меру, інакш жаданне як след адпачыць пасля цяжкага тыдня можа нашкодзіць.

РЫБЫ. На гэтым тыдні не абмяжоўвайце сябе ў зносінах. Гэта пойдзе вам толькі на карысць, даведаецеся шмат новага. У шматлікіх прадстаўнікоў знака адбудзецца нечаканы пераварот у прафесійнай дзейнасці, верагоднасць змены працы. Панядзелак можа аказацца імпульсіўным днём, але пры пэўных намаганнях ён складзецца добра. У чацвер поспех можа чакаць тых, хто займаецца дакладнымі навукамі. У канцы тыдня ёсць верагоднасць, што давядзецца заняцца арганізацыйнымі справамі.

27 ЛІПЕНЯ — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

1320 год — бітва каля Меднікаў паміж войскам Тэўтонскага ордэна і войскам Вялікага Княства Літоўскага. Бітва скончылася перамогай Вялікага Княства Літоўскага. З нямецкага боку загінулі ўсе 40 братоў-рыцараў і іх дапаможны кантынгент. Перамога войска ВКЛ прывяла да перахопу княствам на нейкі час ініцыятывы ў вайне, якую вялі з перапынкамі нямецкія рыцарскія ордэны (Тэўтонскі, Інфлянцкі (Лівонскі) і іншыя) супраць ВКЛ, у асноўным у Жамойці і ў беларускім Панямонні.



1824 год — пачалося будаўніцтва Аўгустоўскага канала, помніка гідратэхнічнага будаўніцтва ў Гродзенскім раёне Беларусі і Падляшскім ваяводстве Польшчы. Будаўніцтва завершана ў 1839 годзе. Аўтар праекта і кіраўнік будаўніцтва — І. Прандзінскі. Канал злучае рэкі Нёман і Бебжа (басейн Віслы). Даўжыня 102 км, з іх на тэрыторыі Беларусі — 22 км. Утвораны з сістэмы каналаў, азёр, сажалак, каналізацыйных участкаў рэк і пратокаў паміж азёрамі. У Беларусі ўключае частку р. Чорная Ганча паміж вёскамі Лясная і Сонічы і асобна рэчышча, якое злучае гэтую раку з Нёманам каля в. Нёмнава. Ахоўваецца як гістарычны помнік, з'яўляецца рэкрэацыйна-турыстычным аб'ектам.

1899 год — нарадзіўся Станіслаў Аляксеевіч Ваўпшасаў, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. У 1918 годзе добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях на Заходнім фронце. У 1920—1925 гадах кіраваў партызанскімі атрадамі ў Заходняй Беларусі. Удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, савецка-фінскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1941 года — на Заходнім фронце, камандзір батальёна мотастралковай брыгады спецыяльнага прызначэння, якая абараняла Маскву. З сакавіка 1942 года — у тыле ворага, камандзір партызанскага атрада «Мясцовыя», які дзейнічаў у Мінскай вобласці, член Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б, які базіраваўся пры яго атрадзе. Да 1958 года працаваў у органах дзяржбяспекі, палкоўнік. Імем С. А. Ваўпшасава названа вуліца ў Мінску.

1944 год — войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе баёў па ліквідацыі акружанай групоўкі фашысцкіх войскаў вызвалена больш чым 50 населеных пунктаў.

1949 год — нарадзіўся Антон Уладзіміравіч Вавілаў, доктар тэхнічных навук, прафесар, замежны член Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук, прафесар двух універсітэтаў — Беларускага нацыянальнага тэхнічнага и Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага, вядомы вучоны ў галіне тэхналагічнага машынабудавання, энергаэфектыўнасці і экалагічнай бяспекі, заснавальнік кірунку палівазабяспячэння нетрадыцыйнымі энергарэсурсамі. Аўтар больш чым 570 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій. Навуковую дзейнасць паспяхова спалучае з літаратурнай працай. Ужо выдадзена дзве кнігі.

1990 год — Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце краіны.

У свеце

1549 год — хрысціянскі місіянер Францыск Ксаверый першым з еўрапейцаў дасягнуў берагоў Японіі.



1841 год — у дуэлі загінуў выдатны рускі паэт, драматург і празаік Міхаіл Лермантаў.

1953 год — заканчэнне Карэйскай вайны: ЗША, КНР, Паўночная Карэя і Паўднёвая Карэя падпісваюць пагадненне аб спыненні баявых дзеянняў.

Так гаварыў...

ЯНКА СІПАКОЎ:

«Толькі са сваёю, а не чужою душою чалавек застаецца чалавекам, а без душы — ён ужо ніхто, ён проста раб і ўжо не супраціўляецца ніякаму здзеку, ніякай абразе».

СЁННЯ

Месяц

Поўня 21 ліпеня.

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Аніcіма, Івана, Сцяпана.*
К. *Марты, Наталлі, Юліі, Рудольфа, Фелікса, Юрыя.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.15	21.16	16.01
Віцебск —	4.59	21.11	16.12
Магілёў —	5.05	21.06	16.01
Гомель —	5.09	20.56	15.47
Гродна —	5.31	21.30	15.59
Брэст —	5.39	21.23	15.44

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Званок аператару сотавай сувязі:
— Дзяўчына, да мяне не даходзяць SMS!
— Калі ласка, засяродзьцеся і ўважліва прачытайце іх яшчэ раз.

— Як ты можаш трываць сваю жонку? Яна ж у цябе вечна бурчыць, пілуе, чапляецца да кожнай дробязі. У яе калі-небудзь увогуле бывае добры настрой?

— Ды не дай бог! Калі ў яе добры настрой, яна яшчэ і спявае!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 12.119. Індэкс 63850. Зак. № 1647.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2024 года.